РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ВЕТЭРЫНАРНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ Ў XX СТ.

Сільчанка Д.А.,
студэнтка 2 курса УА "ВДАВМ", г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Півавар К.С., канд. філал. навук

Пад ветэрынарнай тэрміналогіяй разумеюць сукупнасць навуковых найменняў працэсаў і з'яў, якія адносяцца да ветэрынарных дысцыплін. Ветэрынарна-медыцынская тэрміналогія складаецца з трох асноўных тэрміналагічных груп: анатамічнай, клінічнай, і фармацэўтычнай. Актуальнасць даследавання выклікана неабходнасцю лінгвістычнага ўпарадкавання тэрмінасістэмы ветэрынарыі.

Мэта артыкула – выявіць асноўныя этапы развіцця ветэрынарнай тэрміналогіі ў XX ст.

Матэрыял і метады. Матэрыялам даследавання паслужылі выдадзеныя ў 1920-я-1990-я гады XX ст. лексікаграфічныя выданні, у якіх разглядаецца ветэрынарная тэрміналогія на беларускай мове. Метады – апісальны, дыяхранічны (гістарычны).

Вынікі і іх абмеркаванне. Фарміраванне нацыянальнай тэрміналогіі ў межах новай літаратурнай мовы прыпадае на 1920–30-я гады, калі беларуская мова набыла статус дзяржаўнай мовы, актыўна ішлі працэсы беларусізацыі і востра паўстала праблема пераводу навучання на беларускую мову. У гэты ж час, у 1924-м годзе адбылося адкрыццё Віцебскага ветэрынарнага інстытута – першай вышэйшай навучальнай установы такога профілю на тэрыторыі Беларусі. Выкладчыкі гэтай навучальнай установы друкавалі свае працы на беларускай мове на працягу ўсяго XX ст. (працы Х. С. Гарагляда, У. П. Лемеша, М. С. Жакава і інш.).

У лютым 1921 г. была створана Навукова-тэрміналагічная камісія пра Народным камісарыяце асветы Беларусі, якая занялася распрацоўкай тэрміналогіі па ўсіх дысцыплінах у галіне дакладных і гуманітарных навук. Вынікам працы Навуковай тэрміналагічнай камісіі сталі кароткія слоўнікі тэрмінаў па розных галінах навук. Істотнай рысай гэтай тэрміналогіі была высокая ступень варыятыўнасці, абумоўленая, перш за ўсё, падачай часткі запазычаных тэрмінаў разам з беларускімі лексемамі або неалагізмамі. Як сведчыць план навуковай работы Інбелкульта на 1927–33 гг., у 1931–33 гг. павінны былі выйсці тэрміналагічныя слоўнікі па заалогіі, антрапалогіі, садоўніцтве і агародніцтве, ветэрынарыі, жывёлагадоўлі, археалогіі, мікрабіялогіі, гідраўліцы і іншых галінах навукі і [1, с. 86]. Аднак сталінскія рэпрэсіі ў пачатку 1930-х гадоў супраць вядучых вучоных Беларускай акадэміі навук не дазволілі належным чынам закончыць запланаваную працу па падрыхтоўцы выданні чарговых выпускаў "Беларускай навуковай тэрміналогіі". З выдадзеных прац гэтай серыі да ветэрынарнай тэматыкі можна лічыць выпускі: 9. Анатамічныя назвы. Агульныя назвы. Касцяведанне. Вязаведанне. 1926; 12. Назовы жывёл. 1927; 13. Анатамічныя назвы Ч. 2. Ангіялогія. 1927; 19. Слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі (Праект) 1928; 20. Анатамічныя назвы. Ч. 3. Неўралогія. 1929 [4].

Асобныя працы друкаваліся незалежна ад выпускаў Беларускай навуковай тэрміналогіі. Як, напрыклад, Слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналёгіі ў ліку 1674 тэрмінаў (Мінск, 1929); "Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік" Зоські Верас, "Матэрыялы да беларускай народнай заалагічнай тэрміналогіі. Спіс назваў птушак і некаторых рыб" А.У. Фядзюшына.

З цягам часу беларуская ветэрынарная тэрміналогія развівалася і ўдасканальвалася. Але ў 30–40-я гады праца па стварэнні беларускай тэрміналогіі амаль спынілася. І пасля Вялікай Айчыннай вайны не было агульнага цэнтра па распрацоўцы ветэрынарнай тэрміналагічнай лексікі. Значную ролю ў нармалізацыі беларускай тэрміналогіі адыгралі "Руска-беларускі слоўнік" (1953), "Беларуска-рускі слоўнік" (1962), "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" (1977–1984) і некаторыя іншыя.

Акрамя лінгвістычных крыніц, тэрміны ветэрынарыі ўваходзяць у склад энцыклапедычных галіновых слоўнікаў. Значную ролю ў фарміраванні ветэрынарнай тэрміналогіі ў 70–80 гг. адыграла праца над складаннем "Беларускай Савецкай Энцыклапедыі", "Энцыклапедыі прыроды Беларусі", "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы" і новымі рэдакцыямі беларуска-рускага і руска-беларускага слоўнікаў.

У 90-я гг. у сувязі з прыняццем "Закона аб мовах БССР" і пераходам выкладання шэрагу дысцыплін у ВНУ на беларускую мову з'явілася неабходнасць у стварэнні найперш перакладных тэрміналагічных слоўнікаў, а пазней і тлумачальных. Мовазнаўцы разам са спецыялістамі

Репозиторий ВГУ

розных сельскагаспадарчых галін ведаў актыўна ўключыліся ў распрацоўку такіх слоўнікаў. Вынікам працы стаў выхад "Руска-беларускага слоўніка сельскагаспадарчай тэрміналогіі" пад рэдакцыяй М.В. Бірылы і Г.У. Арашонкавай (Мінск, 1994) [3], які ўключае больш за 70 тысяч тэрмінаў, што адносяцца да розных галін сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама да іншых сфер, непасрэдна звязаных з сельскай гаспадаркай і ветэрынарыяй.

Значны ўклад у развіццё ветэрынарнай тэрміналогіі ў 1990-я гады ўнеслі вучоныя Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны на чале з рэктарам установы адукацыі Антонам Іванавічам Ятусевічам. Былі выдадзены 2 падручнікі на беларускай мове, два перакладныя і адзін тлумачальны слоўнікі [5, 6]. Знамянальнай падзеяй у гісторыі ветэрынарыі на нацыяналньай мове стаў выхад аднатомнай "Ветэрынарнай энцыклапедыі" (1994 г.) [2]. У ёй сабраны амаль усе звесткі па анатоміі, фізіялогіі, прафілактыцы і лячэнні хвароб, утрыманні, кармленні і гадоўлі сельскагаспадарчых жывёл. Стваралі гэту энцыклапедыю вядучыя вучоныя і спецыялісты Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі і жывёлагадоўлі Беларускай аграрнай акадэміі, Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання рэспублікі Беларусь у цесным супрацоўніцтве са спецыялістамі некаторых замежных краін.

Заключэнне. На сучасным этапе развіцця тэрміналагічнай справы на Беларусі асаблівую актуальнасць набываюць пытанні ўдасканалення і ўпарадкавання як тэрміналогіі ў цэлым, так і ветэрынарнай галіновай тэрмінасістэмы ў прыватнасці. Выяўленне і апісанне намі асноўных тэрмінагарфічных прац па ветэрынарыі ў XX ст. дазваляе зрабіць наступныя вывады. Па-першае у гісторыі развіцця ветэрынарнай тэрміналогіі ўмоўна можна вылучыць тры перыяды развіцця – 1900–1930-я; 1950–1980-я гг; 1990-я цяперашні час. Па-другое, развіццё нацыянальнай тэрміналогіі залежыць ад экстралінгвістычных фактараў, найбольш ад моўнай палітыкі дзяржавы, так, палітыка беларусізацыі ў 20-я гг. і абвяшчэнне ў 1990 г. беларускай мовы адзінай дзяржаўнай сталі штуршком для актыўнай тэрмінатворчасці ў галіне ветэрынарыі на нацыянальнай мове.

1. Беларуская мова : энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 1994. – 655 с.

2. Ветэрынарная энцыклапедыя : А–Я / рэд. А. І. Ятусевіч. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1995. – 446 с.

3. Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі / М. В. Бірыла, Г. У. Арашонкава, В. А. Бабкова і інш.; Пад рэд. М. В. Бірылы, Г. У. Арашонкавай. – Мінск : Ураджай, 1994. –560 с.

4. Тэрміналагічныя слоўнікі (асобныя выданні) 1918–1998 гг.: Бібліягр. давед. / Тэрмінал. каміс. пры М-ве адукацыі Рэсп. Беларусь, Нац. навук.-асвет. Цэнтр імя Ф. Скарыны; [Уклад.: Л. Чарняўская, Г. Цыхун]. Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2000. – 74 с.

5. Ятусевіч, А. І., Капліч, В. М. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 292 с.

6. Ятусевіч, А. І., Абрамаў С. С., Лемеш, В. М., Ятусевіч, В. П., Капліч, В. М. Тлумачальны слоўнік-даведнік па ветэрынарыі і заатэхніі. Мінск : Ураджай, 1992. – 338 с.

О СЕМАНТИЧЕСКИХ ТРАНСФОРМАЦИЯХ ЗАИМСТВОВАННОЙ ЛЕКСИКИ В СОВРЕМЕННОМ НЕМЕЦКОМ ЯЗЫКЕ

Степаненко С.М.,
магистрант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь
Научный руководитель – Зайцева И.П., доктор филол. наук, профессор

Язык как сложное и многогранное явление доступен для научного наблюдения в разных аспектах и ракурсах. При его исследовании основное внимание может быть сосредоточено на структурных особенностях определённой языковой моносистемы, которая изучается в плане синхронии или диахронии.

Во всех языках пополнение лексики обычно происходит двумя основными способами: образование слов из уже существующих основ и заимствование иноязычной лексики; таким образом, освоение иноязычной лексики является одним из способов обогащения словарного запаса принимающего языка.

Актуальность данного исследования обусловлена тем, что непрерывный процесс заимствования, как один из основных источников пополнения лексического состава языка, должен быть на современном этапе дополнительно осмыслен в связи с достижениями новейшего этапа

Репозиторий ВГУ